# Белавежа: ілюзія выратавання.

Чаму ў фашыстаў не атрымалася ператварыць пушчу ва ўзорную паляўнічую гаспадарку.

Барацьба за рэсурсы прыродаахоўнай зоны назіралася на працягу ўсяго перыяду існавання пушчы. Перад Другой сусветнай вайной прыродныя багацці не маглі падзяліць паміж сабой шматлікія дзяржаўныя інстанцыі. Вялася масавая высечка лесу, у асабістых мэтах выводзіліся найбольш каштоўныя экспанаты з палаца.

У ходзе імклівага наступлення нямецкіх войск у чэрвені 1941 гада ў Белавежскай пушчы сканцэнтраваліся рашткі адступаўшых савецкіх часцей. Лясны масіў істотна нівеліраваў перавагі атакуючых нямецкіх войск у ходзе Бліцкрыгу, а менавіта прымяненне авіяцыі, танкаў і артылерыі. Такім чынам, у першыя дні вайны пушча стала тым рэсурсам, які нейтралізаваў дзеянні нямецкіх войск, што наступалі.

У першыя дні вайны ў Беланежскай пушчы сабраліся тысячы савецкіх ваенных, у асноўным рэшткі пяхотных і артылерыйскіх часцей. Такая вялікая колькасць нашых войск была хутка выяўлена — і ў канцы чэрвеня ва ўсходняй частцы пушчы завязаўся бой. Для сваёй абароны чырвонаармейцы выкарыстоўвалі папярэдне падрыхтаваныя ўмацаванні, добра замаскіраваныя агнявыя кропкі. У выніку вораг панёс вялікія страты. Салдаты вермахта тлумачылі гэта тым, што ніколі не знаходзіліся ў такім лесе, тым больш не вялі ваенных дзеянняў. Акупанты ахрысцілі пушчу праклятым або "мёртвым" лесам.

Нягледзячы на тое, што прачэсванне гітлераўцамі пушчы завяршылася ў першых чыслах ліпеня, там па-ранейшаму заставалася значная колькасць салдат Чырвонай Арміі са зброяй. Акружэнцы былі вымушаны прасіць дапамогі ў мясцовых жыхароў. Некаторыя салдаты, прызваныя на фронт з бліжэйшых раёнаў, разбегліся па сваіх хатах. Іншыя, хто здолеў пазбегнуць палону, імкнуліся арганізаваць мясцовае насельніцтва сумесна з партыйнымі савецкімі супрацоўнікамі, якія таксама хаваліся ў пушчы, для супраціўлення. Белавежская пушча стала прывабным месцам для развіцця партызанскага руху.

У адпаведнасці з распараджэннем галоўнага ляснічага Трэцяга рэйха Германа Герынга, было загадана навесці "парадак"у пушчы — не дапусціць развіцця партызанскага руху. Меркавалася гэта зрабіць шляхам эвакуацыі звыш ста лясных вёсак, якія размяшчаліся як у самой пушчы, так і на яе ўскраінах. Такім чынам. тэрытарыяльна пушча павінна была вырасці са 100 тысяч да 260 тысяч гектараў. У выніку запаведнік павінен быў стань узорнай паляўнічай гаспадаркай Трэцяга рэйха.



Летам 1941 года з пушчы было пераселена каля 20 тысяч чалавек. Шэраг населеных пунктаў пакідаўся для абслугоўвання лясніцтваў. У некаторых размяшчаліся раенныя гарнізоны. Пазней акупацыйныя ўлады так ахарактарызавалі гэтую эвакуацыю: мерапрыемствы, праведзеныя "без дастатковых падрыхтоўчых мерапрыемстваў і без грунтоўнага гвалту", суправаджаліся спаленнем населеных пунктаў, расстрэлам яўрэйскага насельніцтва, савецкага актыву, угонам мясцовага насельніцтва на прымусовыя работы ў Трэці рэйх.

Жыхары, якія засталіся ў пушчы, павінны былі забяспечваць нямецкія ўлады інфармацыяй аб любых незнаёмцах, якія з'яўляліся ў лесе. Гітлераўцы збіралі інфармацыю аб агульнай колькасці так званых бандытаў, іх месцазнаходжанні і мяркуемых маршрутах перамяшчэння. Акрамя таго, існуючыя прасекі ў пушчы дазвалялі адсочваць усіх прысутных. Пераслед звычайна адбываўся па слядах. Асноўным выратаваннем для людзей у такіх выпадках была цемень і непраходнасць лесу. Адзін з жыхароў пушчы ўспамінаў, як па вечарах узброеная ахова вескі Ясень для запалохлання проста страляла ў лес. А

нярэдка пры з'яўленні сілуэтаў у іх кідалі гранаты, якія там былі асноўнай зброяй.



Для кантралявання "добранадзейнасці" мясцовага насельніцтва рыхтаваліся шпіоны. У асноўным, з савецкіх ваеннапалонных, якія наведвалі пушчанскія вёскі пад выглядам партызан. Наведванне жыхароў запаведніка магчыма было толькі з дазволу мясцовых улад і толькі для ажыццяўлення пэўнай працоўнай дзейнасці.

Мясцоныя жыхары, якія засталіся ў запаведніку пасля эвакуацыі, былі практычна ізаляваныя ад рэсурсаў пушчы. Браканьерства і незаконная высечка лесу з іх боку адсутнічала, бо само знаходжанне ў лесе, тым больш са зброяй, разглядалася як бандытызм і пагражала расстрэлам. Партызаны, у сваю чаргу, падявалі вельмі рэдка, бо маглі сябе выдаць. Як правіла, на жывёлу палявалі супрацоўнікі лясніцтваў, нямецкія ахоўныя падраздзяленні і госці, якія прыбывалі ў пушчу.

Зубр у гэты час меў сімвалічную ролю. Яго імен, як і назвамі іншых відаў жывёл, называліся карныя аперацыі. Вальеры зуброў часам выкарыстоўваліся тымі, каго пераследавалі, як часовае сховішча.

Спадар Саевіч, які жыў у пушчы падчас нямецкай акупацыі, успамінаў, што гітлераўцы, якія размясціліся ў яго вёсцы, перыядычна выходзілі на засады ў лес і вярталіся з забітымі: партызанамі або беглымі васннапалоннымі. Чалавек стаў асноўным аб'ектам палявання ў пушчы. Тыя, каму пашчасціла не трапіць пад варожую кулю, рана ці позна станавіліся перад выбарам: заставацца там пад пагрозай быць знойдзеным або шукаць новае сховішча ў бліжэйшых лясных масівах.

Аб цяжкасцях выжывання ў пушчы расказваў удзельнік партызанскага руху Шубіцідзэ: "Ніхто з нас не ведаў тады, што пушча разбітая на роўныя, пранумараваныя квадраты, а за кожным з іх нястомна назіраюць гітлераўцы. Ім вядомы кожшы новы след на снезе. Мы апынуліся амаль у поўнай ізыляцыі. Каб сустрэць каго-небудзь з мясцовых жыхароў, трэба было выходзіць далёка з пушчы. Толькі мы прыблізіліся да вёскі, як на ўскрайку яе нехта зазваніў у рэйку. Аказалася, вартавыя заўважылі нас і апавясцілі суседнія гарнізоны. Як быццам нехта нястомна сочыць за намі і ўсё паведамляе немцам. Боепрыпасы выдаткавалі, а толку ніякага. Заўтра пойдзем далей на ўсход".

Так Белавежская пушча стала ілюзіяй выратавання. Тым не менш, яна вабіла новых і новых уцекачоў, якія шукалі астравок бяспекі на акупіраваных тэрыторыях. Часта ўцекачы з розных лагераў выкарыстоўвалі запаведнік як прахадны шлях на ўсход. Мясцовыя жыхары нярадка ўспрымалі блукаючых па лесе людзей як партызалаў. Рэальныя ж партызаны прыбывалі ў Белавежскую пушчу на кароткі перыяд: для разведкі або для выканання невялікіх аперацый супраць ворага.

***

**Як ахоўваемая прыродная тэрыторыя Белавежская пушча вядомая яшчэ з 1409 года. Менавіта тады польскі кароль Ягайла, якому належаў запаведнік, выдаў указ, згодна з якім паляванне на буйнога звера у пушчы забаранялася. З 1413 года Белавежская пушчэ ўваходзіць у склад Вялікага Княства Літоўскага, а з 1795 — у склад Расійскай імперыі. У 1939 гадзе лясны масіў становіцца ўласнасцю БССР, і на яго тэрыторыі ствараецца Беларускі дзяржаўны запаведнік "Белавежская пушча".**

У 1942 годае немцы правялі чарговыя эвакуацыі. З той жа мэтай — для "супакаення" рэгіёна. І ў чарговы раз пушча была напоўнена ўцекачамі, у тым ліку яўрэйскай нацыянальнасці. Са знойдзенымі гітлераўцы распраўляліся жорстка. Напрыклад, 4 снежня 1942 года ў прымітыўных зямлянках яны знайшлі 18 яўрэяў, якіх расстралялі на месцы. У чэрвені 1943 года немцы натрапілі на бункер, дзе

жыла яўрэйская сям'я. Звычайна ў такія бункеры кідаді гранату...

У сярэдзіне 1943 года з Мінска на Беласточчыну быў накіраваны партызанскі атрад колькасцю ў тысячу чалавек, які павінен быў працаваць з мясцовым насельніцтвам, пашыраці групу супраціўлення. Але іх спроба замацавацца ў пушчы не ўдалася. У справаздачы аб стане партызанекага руху ў Беластоцкай вобласці паведамлялася: "Як вядома, нам не ўдалося замацавацца ў Белавежскай пушчы брыгадамі і атрадамі. З'яўленне ў гэтых месцах атрадаў і брыгад выклікала неадкладную аблаву буйнымі сіламі войск СС, паліцыі, пагранічнікаў і жандармерыі". Нягледзячы на гэта, партызаны ўладкаваліся ў прылеглых лясах і хадзілі ў Белавежскую пушчу на разведку, дзе час ад часу праводзілі падрыўныя акцыі. Апісваючы ў сваіх успамінах запаведнік, партызаны ўдакладнялі, што дрэвы тут большыя, чым у іншых лясах. А яшчэ яны аднойчы хацелі забіць і з'есці зубра, але пашкадавалі.

Падчас вызвалення Беларусі летам 1944 года народныя мсціўцы ўступілі ў актыўную барацьбу за рэсурсы Белавежскай пушчы. Яны перашкаджалі немцам вывозіць лес, разбуралі вузкакалейкі, разбіралі завалы, ратавалі насельніцтва ад вывазу ў Германію. Нават быў распрацаваны спецыяльны план па выратаванні зуброў: баяліся, што акупацыйныя ўлады вывезуць каштоўных жывёл з пушчы.

Прыродны запаведнік вызвалялі 16 і 17 ліпеня 1944 года. Савецкія войскі чакалі ўпартага супраціўленння. Нават разглядвалася прымяненне авіяцыі, што магло прывееці да катастрафічных наступстваў. Аднак насуперак чаканням супраціўлення аказана не было. Нямецкін войскі паспелі толькі ўзарваць палац, спаліць і вывесці частку навуковых калекцый, замініраваць некаторыя дарогі, у выніку чаго пацярпелі жывёлы.

У справаздачы аб дзейнасці запаведніка за 1944 год паведамлялася: "З-за праходжання вялікай колькасці войск праз пушчу, працяглым стаянкам воінскіх часцей у межах пушчы і паблізу яе фаўне Дзяржзапаведніка нанесена некаторая шкода. Так, у першыя дні праходжання фронту забіта 8 галоў зуброў, выпушчаных у пушчу немцамі, невялікая колькасць аленяў, а на працягу наступных месяцаў — значная колькасць кабаноў (да 300 галоў). З адыходам воінскіх часцей з межаў пушчы ахова была наладжана і адстрэл жывёл спыніўся".



Дарэчы, для прадухілення вынішчэння жывёльнай папуляцыі маршалам Ракасоўскім быў выдадзены спецыяльны ўказ аб забароне масавага палявання ў пушчы, яно прыраўноўвалася да браканьерства. У 1944 годзе Белавежсквя пушча была падзелена на дзве часткі. Большая адышла беларускаму боку, але найкаштоўнейшая інфраструктура стала належаць Польшчы. Статак зуброў першапачаткова застаўся ў польскай Белавежы.

Такім чынам, у гады Вялікай Айчыннай вайны Белавежская пушча мела стратэгічны рэсурс пры адступленні савецкіх войск, разглядвалася ў якасці сховішча для ахвяр халакосту, ваеннапалонных, некаторых мясцовых жыхароў. Часам гэта была ілюзія выратавання. Але планы гітлераўцаў пераўтварыць пушчу ва ўзорную паляўнічую гаспадарку не былі рэалізаваны. Хутчэй аб'ектам палявання для іх стаў чалавек...

***Артыкул падрыхтаваны на аснове даклада кэндыдата гістарычных навук Аляксандра Далгоўскага, супрацоўніка праекта "Белавежскі нацыянальны парк. Чалавек, жывёльны свет і навакольнае асяроддзе ў беларуска-польскім пагранічным рэгіёне", які фінансуецца нямецкім даследчыцкім таварыствам.***

***Вераніка КАНЮТА***
***Фота Анатоля КЛЕШЧУКА***

**Источник:** Родная прырода. — 2015.— №4. — С.14-16